Урок беларускай мовы ў 8 “А” класе.

Тэма: Зваротак. Знакі прыпынку пры звароткy.

Мэты:

1. Сістэматызаваць веды па тэме, паглыбіць іх.
2. Развіваць уменне знаходзіць звароткі ў сказах, выдзяляць звароткі знакамі прыпынку.
3. Развіваць вуснае і пісьмовае маўленне вучняў.

Абсталяванне: падручнік, апорна – тэкставы дыдактычны матэрыял.

Ход урока:

I. Арганізацыйны момант
II. Я хачу пачаць урок з народнай мудрасці:

(на дошцы запісаны сказы)

— Ад спеху не нарабі, сябар, смеху
— Акуратная работа, мае сябры, акуратных людзей любіць
— Вачам страшна, а рукі возьмуцца і зробяць

Заданні:

1) Тлумачэнне сэнсу прыказак
2) Тлумачэнне падкрэсленых арфаграм
3) Якая прыказка лішняя і чаму?
4) Значыць, зваротак — гэта … (франтальнае апытванне, на партах у вучняў есць апорныя канспекты); спасабы выражэння звароткa; будова звароткa
5) Праверка дамашняга задання (пр.290)
6) Як выдзелены звароткі ў тэксце пр. 290?
7) Ці ўсе ведаем пра выдзяленне звароткаў?

III. Значыць, вы ўжо здагадаліся, што тэма ўрока (называюць вучні), мэта ўрока (называюць вучні)

Дэвіз урока (запісаны на дошцы): Разам можна зрабіць тое, што складана зрабіць аднаму. Як разумееце сэнс?

Фізкультмінутка

На дошцы: Формула поспеху:

— Свабодна абменьваемся думкамі
— Маем права на памылку
— Крытыка забараняецца
— Паважаем думку кожнага

IV. Выконваючы дамашняе заданне, вы звярнулі ўвагу на месца звароткаў у сказе

— Дзе можа знаходзіцца зваротак?
— Якія знакі прыпынку пры ім стаяць?

Запісваюць пад дыктоўку натупныя сказы:

1. Дык уздымі свой голас – звон з глыбінь душы, пясняр!
2. Ты красуй, наш сад, красуй і шумі, зялены.
3. Эх, луг шырокі, як жывы ты!
4. Гэй ты, гусляр, заспявай па душы, дай уцехі гасцям!
5. Ой, ты, падыдзі сюды!
6. О Радзіма! Табою напоўнена сэрца да болю!

(тлумачэнне знакаў прыпынку і арфаграм)

Не блытаць: О! Міхале! Міхале! Што такое?

Настаўнік:

1. З якіх вядомых вам вершаванных твораў тут есць сказы?
2. Успомніце радкі з вершаў ці з празаічных твораў, дзе есць звароткі. А вашы сябры, калі будзеце чытаць, пастараюцца гэтыя звароткі запісаць у сшыткі (потым тлумачым будову, спосаб выражэння звароткаў, месца ў сказе, знакі прыпынку).
3. А ці патрэбны, рабяты, наогул гэтыя звароткі ў маўленні? Якая іх роля? (выступленне падрыхтаванага вучня па тэме пытання)
4. Што ж гэта за знак такі, гэты зваротак? (апераджальнае заданне, выступленне вучня)
5. А як вы, напрыклад, звернецеся да ўрача, да незнаемага на вуліцы, да прадаўца?

V. А зараз звернемся да тэкстаў (на сталах)

Раз завяла чараціна з дубам гаворку:

— Чаму дубе цябе не можа адолець бура? Яна лютуе над табой, а ты моцна стаіш на зямлі. На тваей галаве дружа бусел звіў гняздо, а ты

стаіш як стаяў. А я вось увесь час гнуся. Скажы мне дуб адкуль твая сіла? І чаму я іакая слабая?

І кажа дуб ей:

— Ты палахлівая чараціна баішся жыцця. Усім хочаш дагадзіць. А хто любая не спадзяецца на сябе, той і бывае слабы. Змалку я навучыўся дапамагаць сам сабе. Нікому я не гнуся.

Заданні да тэксту:

— Вызначыць стыль, тып тэксту
— Растлумачыць арфаграмы
— Знайсці сказы са звароткамі, паставіць знакі прыпынку, растлумачыць

1 вар. – 1 ч. тэксту; 2 вар. – 2 ч. тэксту

— У 1 ч. тэксту знайсці сказ з састаўным дзеяслоўным выказнікам.
— Ці звязаны тэкст з эпіграфам да ўрока? (робім вывад, тлумачым)

VI. Скласці сказы са звароткам па схемах

а)

| 1 рад | 2 рад | 3 рад |
|---|---|---|
| … О! | Эх ты О… | Ой вы О… |
| … О … | | |

б) Вусна скласці сказ, каб слова ВЫ было членам сказа.

VII. Зварот да эпіграфа. Ці дасягнулі мэты? (выстаўленне адзнак)

VIII. Жадаю вам, мае дарагія, плену і надалей. А веды, рабяты, як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблудзіцца ў жыцці. Памятайце пра гэта.

IX. Дамашняе заданне: § 43, пр. 303